НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

№ 7 (119), ТРАВЕНЬ 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

МЕРКАВАННЕ РЭДАКТАРА

## РАСПЛАТА ЗА ПАДМАН

Яшчэ задоўга да прэзідэнцкіх выбараў кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка і прадстаўнікі яго вертыкалі на розных узроўнях пачалі раздаваць народу шчодрыя абяцанкі. Асноўны ўпор рабіўся на памер заробкаў. Да 1 студзеня 2011 года была абяцана сярэдняя заработная плата ў 500 даляраў, а да 2016 года яе планавалі давесці да 1000 долараў. Трэба сказаць, што абяцанкі ўладаў з большага спраўдзіліся. Урад, "кроў з носу", як таго і патрабаваў Лукашэнка, даганяў зарплату да адзнакі ў 500 даляраў. Паводле дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта ў снежні-студзені намінальная налічаная сярэднемесячная зарплата ў Беларусі склала 1млн. 238 тыс. беларускіх рублёў. Пры гэтым самы нізкі курс даляра быў зафіксаваны ў сярэдзіне студзеня – 2 тыс. 832 бел. рублёў. Праўда, большасць людзей добра адчувае на сваёй скуры, што такое сярэдняя зарплата. Вобразна кажучы, адзін з'еў курыцу, а другі – нічога, а ў цэлым абодва сытыя. Калі чыноўнікі атрымлівалі ад 3 да 5 мільёнаў рублёў, то рабочыя ў глыбінцы , у тым ліку і ў нашым раёне ад 500 да 600 тысяч. Але як бы там ні было, задача кіраўніка дзяржавы была выканана, і народ пагналі на выбары. Пасля "элегантнай перамогі" Аляксандра Лукашэнкі народ, які нібыта делегаваў яму бубновыя паўнамоцтвы, стаў на пяць гадоў непатрэбен. А гэта азначае, што штучна завышаныя даходы насельніцтва можна адкруціць назад, да мінімальных патрэбаў. Не атрымаўшы чарговых крэдытаў з Масквы, рэжым стаў забіраць у насельніцтва нічым не забяспечаную грашовую масу шляхам падвышэння курса даляра. Адпаведна пачаўся і рост цэнаў, у асноўным на прадукты харчавання. Часам можна было назіраць, як у вясковых крамах нашага раёна прадаўцы сядзелі за сталом і кожны дзень перапісвалі цэны. Людзі адчулі падман і кінуліся ў абменнікі за валютай. Пачалася валютная ліхаманка – курс даляра стаў расці літаральна кожны дзень. Каля абменнікаў утварыліся чэргі. У адзін з травеньскіх дзён каля Шумілінскага філіяла "Беларусбанк"нават утварыўся натоўп каля 50-ці чалавек, чаго яшчэ ніколі не было. А тыя, каму не хапіла валюты, рынуліся ў прадуктовыя крамы. Людзі таўкліся ў крамах і на рынках, вышукваючы тавары, якія можа і непатрэбны ім сёння, але якія прадаюцца яшчэ па старым цэнам. Незнаёмы з сітуацыяй назіральнік мог бы падумаць, што нашым людзям няма куды дзяваць грошы – так многа яны зарабляюць. Людзі хапалі муку, крупы, алей, макароны, воцат, соль. Найбольшы ажыятаж, як заўсёды быў на цукар: разбіралі мяхамі. Насельніцтва тоўпілася ў чэргах і ўжо пачало крыху лаяць уладу. Дарэчы, у Менску дайшло да таго, што за адсутнасць цукру да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута 46 кіраўнікоў гандлёвых арганізацый. А што кіраўнікі Рэспублікі Беларусь? Можа яны выступілі перад народам, растлумачылі сітуацыю, далі карысную параду? Нічога падобнага. Лукашэнка і яго падначаленыя толькі гулялі ролю псіхатэрапеўтаў. Яны супакойвалі народ нейкай бязглуздзіцай, як некалі супакойваў галоўны банкір Пятро Пракаповіч, які да апошняга заклікаў несці людзей усе свае зберажэнні ў дзяржаўныя банкі, як беларускіх рублях, так і ў валюце. І людзі даверылі дзяржаве і няслі свае кроўныя рублі ў банкі. Няслі да тае пары, пакуль не ўскрылася ўся крывадушнасць сістэмы вертыкалі чыноўнікаў цяперашняй улады. Перад выбарамі яны ўсе дружна вішчэлі пра значнае паляпшэнне ўзроўню жыцця. Насамрэч усё аказалася наадварот. Улада народ падманула, прычым падманула ўжо ў каторы раз. Здавалася б, за хлусню кіраўнікоў дзяржавы павінны адказваць прадстаўнікі ўладнай вертыкалі. Аднак на самай справе атрымліваецца, што калі ўлада хлусіць, дык чамусьці за гэтую хлусню расплочваецца народ. Той, хто паверыў пустой балбатні Аляксандра Лукашэнкі перад "выбарамі"– атрымаў пустыя паперкі, штурханіну ў абменніках і крамах, трывогу аб заўтрашнім дні. Хто выйграў? Той хто і заўсёды – пастаянна растучая арміі чыноўнікаў – несумненна, што гэты кантынгент падчас крызісу яшчэ больш пабагацее. Відавочна , што гэта толькі для іх будуе Аляксандр Лукашэнка сваю Рэспубліку Беларусь. Гэта для іх ён "бацька". Квітней Беларусь!

**Аляксандр Шчамлёў.**

ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

## ІНВЕСТ-ФОРУМ МЯСЦОВАГА МАШТАБУ

Прадстаўнікі прадпрыемстваў Шумілінскага раёна ўпершыню сабраліся на інвестыцыйна-інавацыйны форум. Калі гаварыць канкрэтна, дык яны наладзілі выставу, на якой паказалі сваю прадукцыю. Пры гэтым на форум былі запрошаны патэнцыйныя інвестары з Віцебска, Гарадоцкага і Бешанковіцкага раёнаў, з Ленінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Інфармацыю аб таварах і узоры сваёй прадукцыі прадставілі найбольш буйныя прадпрыемствы Шумілінщчыны. Сёлета найлепшыя паказчыкі маюць "Вітконпрадукт", цэх ААТ "Малако", "Вежа", "Славянскі прадукт", "Обальскі керамічны завод". У рамках рэалізацыі экалагічных праектаў удзельнікаў форума праінфармавалі аб прыродных рэсурсах нашага раёна.Спецыяліст аддзела адукацыі Л. Маладзечкіна азнаёміла зацікаўленых гасцей форума з праектамі па абароне рэчак, захаванні ўнікальных Обальскіх балот, дзейнасці грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны". Прынамсі, віцебскі "Белвест" засяродзіў увагу на будынках былога Казьянскага лясніцтва.Мясціны тут маляўнічыя. Цалкам верагодна, што абласному прадпрыемству спатрэбілася гэта тэрыторыя для арганізацыі адпачынку. Апошнім часам колькасць зарэгістраваных суб'ектаў гаспадарання пастаянна расце. Новыя прыватныя унітарныя прадпрыемствы – гэта найперш дадатковыя рабочыя месцы. На інвест-форуме знайшлі паразуменне і делавыя людзі. Наш зямляк, заснавальнік прыватнай фірмы "ТрАК –Прым" А. Коржаль дамовіўся аб рэалізацыі двух лагістычных праектаў з ленінградцам, дырэктарам Фонду сацыяльнай і эканамічнай стабілізацыі Ю. Цоем. Іншыя госці з Расіі зацікавіліся Дабейскім возерам. На дне возера знаходзіцца да 12 мільёнаў тон сапрапеляў – каштоўнай сыравіны, з якой у Расеі вырабляюць да 40 відаў прадукцыі. Распрацоўка радовішча пачалася яшчэ ў пачатку 90-х гадоў, аднак затым работы былі спынены: не хапіла сродкаў. Цяпер ёсць спадзяванні, што расейскі капітал дасць свой плён і на шумілінскай зямлі.

**Я. Вайтовіч.**

КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

## Гучалі беларускія песні

Абласное свята- конкурс выканаўцаў беларускай песні пад назвай "На зямлі святой Сафіі" праходзіла ў горадзе Полацку. Народныя і эстрадныя кампазіцыі гучалі ў выкананні вакальных ансамбляў і салістаў-вакалістаў з раёнаў Віцебскай вобласці, а таксама з Палоцка, Наваполацка і Воршы.Галоўная ідэя фестывалю: яднанне славянскіх народаў праз гістарычныя, традыцыйна-культурныя, духоўныя сувязі. У конкурсе прымалі ўдзел выканаўцы ва ўзросце ад 16 да 30 год па наступным намінацыям: "Беларуская народная песня", "Эстрадная песня беларускіх кампазітараў". Памерацца сваімі талентамі на конкурс паехалі і нашы шумілінскія самадзейныя артысты. Вельмі ўдала выступілі ў намінацыі "вакальныя групы" спевакі квартэта ў складзе Яўгена Казлова, Аляксея Шчарбакова, Андрэя Крыўцова, Валерыя Дарзнека. Яны выканалі аўтарскую песню шумілінскага фальклараста Антона Парaскевіна "Пахне бэзам і дымам". Па ўсяму відаць, што гэта мілагучная песня закранула сэрцы слухачоў, а удала падабраны рэпертуар дазволіў нашаму квартэту заняць на конкурсе трэцяе месца. У намінацыі саліст-вакаліст таксама вызначыўся Андрэй Крыўцоў, які выканаў сваю аўтарскую песню "Жураўлі" і песню з рэпертуара вядомага мэтра беларускай эстрады Анатоля Ярмоленкі "Бацькоўскі зруб". У гэтай намінацыі шумілінскаму спеваку прысудзілі трэцяе месца. І сёлета нашы артысты вярнуліся дадому са свята беларускай песні "На зямлі святой Сафіі" з сувенірнымі кубкамі і дыпломамі. Безумоўна, што актыўны ўдзел нашай моладзі ў падобных конкурсах садзейнічае папулярызацыі беларускай народнай песні, выяўляе таленавітых і павышае выканаўчае майстэрства яго ўдзельнікаў.

**С. Горкі.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

## У Шуміліне маліліся за Беларусь

13 траўня ў нашым райцэнтры адбылася падзея, якая не сціраецца з памяці людской, застаецца ў гісторыі назаўсёды. Каля трохсот вернікаў сабраліся на літургію ў касцёл маці Божай Фацімскай. На святочнае богаслужэнне прыйшлі 200 паломнікаў з розных гарадоў Беларусі: Полацка, Віцебска, Брэста, Новаполацка, Гарадка. Марыю Фацімскую ўшаноўваюць з 1917 года, калі святая ўпершыню з'явілася тром пастушкам. Менавіта з тых часоў яна дапамагае тым, хто моліцца, жыве без грахоў. Таму неад'емная частка свята абрада агапэ ( у перакладзе з грэчаскай мовы "адданая любоў"). Па трыдцыцы парафіяне частуюць адзін аднаго ласункамі, вітаюць цёплымі словамі. У гонар гэтай асаблівай падзеі на ўрачыстым богаслужэнні прысутнічаў ксёнз дон Кармэла з Італіі і біскуп Віцебскай епархіі Уладзіслаў Блін. У сваёй прамове біскуп пажадаў, каб у сэрцах засталіся бог, надзея і любоў. Кожнаму ў дзень адпушчэння грахоў трэба адкінуць ад сябе шкодныя звычкі, чэрствасць, якія перашкаджаюць жыць людзям. У гэтым дапаможа маці Божая Фацімская. Узнёсла, светла гучалі малітвы, песнапенні дзяўчат (на богаслужэнні было шмат моладзі). Вернікі маліліся за бліжняга, за ўсіх жыхароў Шумілінщчыны, за росквіт нашай роднай мовы, за Беларусь.

**Алесь Прыбярэжны.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў.Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Стварыў сваю справу

Таленавітых жыццёвых складанасці не палохаюць. Некаторыя з іх становяцца сапраўднымі прафесіяналамі, а затым адпраўляюцца ў самастойнае плаванне. Менавіта так і зрабіў Уладзімір Ермаловіч, які ў мінулым годзе стварыў гандлёва-будаўнічае ўнітарнае прыватнае прадпрыемства "Люб Эл Плюс". Прыватнае прадпрыемства вядомае ў нашым раёне тым, што займаецца элеуктрамантажнымі работамі і электрафізічнымі вымярэннямі. Перадусім была зроблена замена электраправодкі ў Крывасельскай, Навікоўскай, Ляжнёўскай школах. Цяпер калектыў прадпрыемства (усяго дзесяць работнікаў) займаецца мантажом электраабсталявання на ферме вёскі Амбросавічы. За перыяд свайго існавання малое прадпрыемства значна пашырыла рынак сваіх паслуг. Літаральна ўсе сельгаспрадпрыемствы раёна звяртаюцца да прадпрымальніка на паслугі па рамонце электраабсталявання аўтатранспарту, па перамотцы электраруханавікоў. Адначасова аказваюць паслугі і насельніцтву раёна: рамантуюць халадзільнікі, тэлефонныя апараты, пыласосы, электрапліты, воданагравальнікі. Ведаюць прыватнае прадпрыемства і за межамі раёна. Спецыялісты-электрыкі займаліся электрамантажнымі работамі ў Наваполацку, ладзілі электразабяспячэнне цэнтраў МТС у Гомелі, Менску і Магілёве. Менавіта якасць і акуратнасць у рабоце з'яўляюцца складнікамі поспеху. Такога прынцыпу тут прытрымліваюцца пастаянна. Нялішне сказаць, што ў дзейнасці унітарнага праватнага прадпраемства не здаралася выпадкаў, калі ім выстаўлялі прэтэнзіі на работы. Цяпер яго калектыў надзейна заваяваў сваё месца на рынку і, што немалаважна давер заказчыкаў.

**Я. Вайтовіч.**

# МАРНАТРАЎСТВА РЭСУРСАЎ

Шумілінскі раён у цэлым не выканаў мэтавыя паказчыкі па энергазберажэнню і дапусціў павышэнне страт цеплавой энергіі – да такіх высноваў прыйшлі спецыялісты райвыканкама. У сваю чаргу кіраўніцтва раёна вымушана было прызнаць, што ў планах пытаннях эканоміі і беражлівасці амаль усімі прадпрыемствамі раёна былі дапушчаны сур'ёзныя пралікі. І гэта на фоне таго, што фінансавы крызіс не мінуў і эканоміку нашага раёна. У гэтых умовах пытанне кантролю за рацыянальным выкарыстаннем матэрыяльных і энергетычных рэсурсаў становіцца надзвычай важным. На жаль, падчас праверак выяўляюцца такія факты, калі дзяржаўныя сродкі і маёмасць выкарыстоўваюцца не па-гаспадарску. У ходзе праверак высветлілася, што прадпрыемствы з энергаёмістай вытворчасцю, такія, як Обальскі керамічны завод, сельгаспрадпрыемствы раёна, жыллёва-камунальная гаспадарка дапусцілі рост матэрыяла- і энергаёмістай вытворчасці. Атрымаўшы вялікія дзяржаўныя сродкі, затрачаныя на рамонт цеплатрас, новае абсталяванне кацельняў шумілінскі камунгас па-ранейшаму дапускае рост страт цяпла, зніжае працэнт спажывання мясцовых відаў паліва. Апроч таго, лясгас не выканаў дагаворы па пастаўках драўніны арганізацыям раёна, а льнозавод не дасягнуў мэтавага паказчыка па энергазберажэнні. У рэшце рэшт неапраўданыя страты негатыўна паўплываюць на эканоміку раёна, таму што не будзе сэканомленых сродкаў, якія затым можна будзе накіроўваць на развіццё вытворчасці.

**Алесь Шумскі.**

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ЧЫСЦІНЯ І ПАРАДАК ЗРОБЯЦЬ НАШ КРАЙ ПРЫГАЖЭЙШЫМ

Тэма добраўпарадкавання заўсёды была ў цэнтры ўвагі. Вось і на гэты раз падчас пашыранай нарады ў Шумілінскім райвыканкаме прысутнічалі адказныя асобы розных служб і арганізацый райцэнтра. Менавіта ад дзейнасці гэтых спецыялістаў і начальнікаў залежыць чысціня і парадак на ўсіх падвёдамасных тэрыторыях нашага раёна. Тэма добраўпарадкавання заўсёды актуальная. І яна ўзнімаецца на розных узроўнях. Таму старшыня райвыканкама Вальдэмар Падляшчук адразу адзначыў, што навядзенне парадку на зямлі ў кожным населеным пункце – гэта патрабаванне кіраўніцтва вобласці і адміністрацыі раёна. Кожнай арганізацыі і прадпрыемству даведзены заданні, і пасля іх выканання тэрыторыі населеных пунктаў павінны выглядаць адпаведна. Разам з тым кіраўнік краёна запатрабаваў ад сваіх падначаленых строгай дысцыпліны і неадкладнага выканання ўсіх мерапрыемстваў і заданняў па добраўпарадкаванню тэрыторый вёсак і пасёлкаў. Час дзяжурных абяцанняў, якія нярэдка не выконваюцца, мінуў. А галоўнымі арганізатарамі пэўных задач былі прызначаны старшыні сельвыканкамаў. Ім на месцах лепш вызначыць праблемы, якія трэба вырашыць у першую чаргу. Як заўважыла старшыня райсавета Ірына Новікава, амаль усе акрэсленыя мерапрыемствы ў бягучым годзе праводзіліся і раней у мінулыя гады. Больш таго, кіраўнікі сельсаветаў сёлета азнаёмлены і з вопытам работы іншых раёнаў. Да прыкладу, быў вывучаны вопыт па навядзенню парадку ў населеных пунктах Валкалацкага сельвыканкама Докшыцкага раёна. Безумоўна, у ходзе раённага месячніка (з 1красавіка па 1 траўня) па санітарнай ачыстцы населеных пунктаў раёна многае зроблена. Сіламі працоўных калектываў і камунальнай службы наводзіўся парадак на могілках, зліквідаваны некалькі несанкцыянаваных звалак, праводзілася азеляненне вуліц і рамонт агароджы. Аднак па-ранейшаму і шмат недахопаў. Вядома, што адна выканаўчая ўлада ўсіх праблем не вырашыць. Не сакрэт, што ў раённым бюджэце не хапае сродкаў. У прыватных дамах нямала дваровых тэрыторый, якія даўно не бачылі гаспадарскай рукі. Нават у аграгарадках уражваюць адносіны некаторых жыхароў да сваіх надворных пабудоў – паўразбураныя хлеўчукі, якімі ніхто не карыстаецца, вакол хмызняк і смецце. Да прыкладу, у аграгарадках Мішнёвічы і Слабада ў непрывабным выглядзе знаходзяцца гаспадарчыя пабудовы, якія выкарыстоўваліся для складзіравання паліва і ўтрымліваліся за кошт гаспадарак. Зараз, калі ў дамы падвялі прыродны газ, яны канчаткова згубілі сваё першапачатковае прызначэнне. У гэтым выпадку райвыканкам рэкамендаваў гаспадарам самім давесці да ладу або разабраць струхлелыя прыбудовы. У дадзеным матэрыяле не называюцца прозвішчы такіх гаспадароў, не ўказваецца адрас. Таму будзем спадзявацца, што справай добраўпарадкавання зоймуцца ўсе. Бо парадак і чысціня – клопат кожнага жыхара раёна. А бадай, што самае галоўнае, каб затрачаныя грошы і праца, накіраваныя на добраўпарадкаванне не прападалі. Да прыкладу, кожны вясну школьнікі саджаюць дрэўцы ўздоўж новых дамоў у аграгарадках, а самі навасёлы (у асноўным маладыя сем'і) у засушлівы перыяд не могуць іх паліць. У выніку дрэўцы не прыжываюцца і гінуць. А гэта ўжо не проста "паказуха", а безгаспадарчасць. Такога не павінна быць. Навошта ж тады працаваць упустую?

**Алесь Шумскі.**

НАША СПАДЧЫНА

# ДАРАЖЭЮЦЬ ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ

У нашым раёне, як і па ўсёй краіне, працягваюць даражэць прадукты харчавання. Менавіта пасля выбараў цэны пачалі расці і нават на асноўныя прадукты. Да таго ж улады абвесцілі, што адпускаюцца цэны на свініну, ялавічыну, рыбу, сыры, бананы, апельсіны, лімоны, каўбасныя вырабы, фарш, пяльмені, субпрадукты. Ніжэй прыведзены параўнальныя кошты на прадукты харчаванняў ў крамах Шумілінскага райспажыўтаварыства.

| **Наименование продуктов** | **декабрь** | **май** |
|---|---|---|
| **Хлеб чёрный** | **1550** | **2110** |
| **Батон** | **1810** | **2000** |
| **Молоко 3,5, 1л** | **1690** | **2100** |
| **Сахар, 1 кг** | **2980** | **3600** |
| **Масло подсолнечное «Золотое семечко»** | **5510** | **8850** |
| **Колбаса вареная «Докторская», 1 кг** | **13580** | **16890** |
| **Макароны, 1 кг** | **2560** | **3360** |
| **Масло сливочное, «Крестьянское», 200 г** | **3730** | **4860** |
| **Крупа рисовая , 1 кг** | **4290** | **6600** |
| **Крупа гречневая , 1 кг** | **5450** | **16230** |

# Лялькі нашых продкаў

Персанальная выстава аўтарскай лялькі, выробленых віцебскімі мастачкамі Любоўю і Аленай Канюшка адкрылася ў Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі. У выставачнай зале прадстаўлены розныя лялькі, якія рабілі нашы продкі ў далёкім мінулым. Даўней лялькі лічылі абярэгамі, іх выраблялі толькі жанчыны, таму што гэта было жаночым рамяством. Віцебскія майстрыхі прывезлі ў Шуміліна цэлыя лялечныя этнаграфічныя кампазіцыі: "На Івана Купалу", "Хлеб ды соль", "Залатая восень". Такі від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, як лялькадзельле – гэта творчы складаны працэс. Тут трэба валодаць тэхнікай скульптуры і дызайну адзення, майстэрствам цырульніка і візажыста. З канструкцыі рознакаляровай тканіны, пластыка і дрэва выходзяць забаўныя персанажы Бабы-Ягі, Шышкі-падарожніцы, Лазніка – раней лічылася, што ў лазні жылі Лазнік з Лазніцай. У простых па першы погляд прадметах народнага быту закладзеная векавая жыццёвая мудрасць. Даўней лялькі займалі выключнае месца ў матэрыяльнай культуры славянскіх народаў. Жанчына, якая стварала абрадавую ляльку, затым перадавала гэтыя веды з пакалення ў пакаленне.

**Алесь Прыбярэжны.**

КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

# НОВАЯ КНІГА ВЕРШАЎ ГЕОРГІЯ СТАНКЕВІЧА

***У выдавецтве «Кнігазбор» выдадзена трэцяя кніга вершаў бешанковіцкага паэта Георгія Станкевіча «Сцяжынамі памяці»***

Першы зборнік вершаў Георгія Станкевіча «Званы» быў выдадзены ў 2003 годзе, а другі – «Мая зорка» з прадмовай Уладзіміра Арлова ў 2009 годзе. І вось на пачатку 2011 года выдадзены трэцці зборнік паэта «Сцяжынамі памяці». Георгій Станкевіч нарадзіўся ў 1962 годзе ў вёсцы Курэйшына Сенненскага раёна і сваю трэццяю кнігу прысвяціў памяці родным мясцінам, сваім бацькам і дзядам. У паэтычнай форме Станкевіч аднавіў свой радавод ад 1855 году распавядаючы пра сваіх прадзедаў і дзядоў. З вялікай любоў і пашанай напісаны вершы пра маці і бацьку, які ў гэтым годзе адзначыў 88 гадавіну свайго жыцця.

Чытачы адчуюць асалоду ад радкоў пра родныя мясціны Георгія Станкеівча, дзе прайшло яго дзяцінства, а таксама сустрэнуцца з вершамі пра родную мову, аб судзе над незалежнай газетай «Крывінка», якую выдае паэт. Зноў мілагучна гучаць і лірычныя вершы пра бэзавае ранне, начны палёт, вяскобыя сцяжынкі дзяцінства.

**Бэзавае ранне**

*Я прачнуся сёння*
*на шпачыным ранні*
*і раптоўна ўспомню*
*пра тваё жаданне*

*Там, дзе ранак дрэмле*
*у абдымках лесу,*
*цэлае бярэмя*
*наламаю бэзу.*

*Дожджыку, што слічна*
*шэпча, не паверу.*
*У твой с он шчаслівы*
*разнасцежу дзверы.*

*Ты размежаш вочы,*
*заіскрышся смехам.*
*Бэзавае ранне*
*будзе нам уцехай.*

Не застаецца Георгій Станкевіч і збоку ад галоўных падзей краіны.

*Пачуй нашы пацеры, Божа,*
*дай волю і сілы нам дай*
*сыйсці найхутчэй*
*з раздарожжа,*
*ад прорвы адвесці наш край.*

*Прачнуцца няхай,*
*хто драмлі,*
*хто здольны наперад ісці.*
*Зрабі, каб сваё атрымалі*
*ўсе зладні яшчэ пры жыцці!*
20.12.2010 г.

Набыць кнігу "Сцяжынамі памяці" магчыма ў рэдакцыі выдання.



**Л. Антонаў.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# ВАЛЮТНЫЙ КРИЗИС. ИСТОРИЯ ВСЕНАРОДНОГО ОБМАНА

ЧЕМ ГЛУБЖЕ ПОГРУЖАЕТСЯ БЕЛАРУСЬ В БОЛОТО ФИНАНСОВОГО КРИЗИСА, ТЕМ ГРОМЧЕ ЗВУЧИТ ВОПРОС: КУДА СМОТРЯТ ПОЛИТИЧЕСКИЕ, ЭКОНОМИЧЕСКИЕ И ФИНАНСОВЫЕ ВЛАСТИ СТРАНЫ? ОНИ ЧТО, НА САМОМ ДЕЛЕ СТОЛЬ НЕКОМПЕТЕНТНЫ И НЕ МОГУТ СПРАВИТЬСЯ? ИЛИ ЖЕ ПРОСТО РЕШИЛИ ПОПРАВИТЬ ДЕЛА В ЭКОНОМИКЕ ЗА СЧЕТ НАСЕЛЕНИЯ?

Пока мы слушали их заверения и клятвы, что девальвации не будет, ползучее обесценивание национальной валюты прокралось в наши кубышки и на банковские счета. В результате произошедшей в мае девальвации белорусского рубля на 45 процентов только потери граждан, доверивших свои вклады банковской системе, достигли около миллиарда долларов США. (9,7 триллиона белорусских рублей вкладов на начало апреля составляли примерно 3,1 миллиарда долларов по курсу обмена 1:3100, с 16-го же мая это - всего лишь 2,1 миллиарда по курсу 1:4500). А ведь еще делают свои гнусные дела и инфляция (за апрель - 4,5 процента), и неучитываемый властями рост цен на социально незначимые, с их точки зрения, товары (в полтора-два раза!).

Сегодня мы раскроем, как нас обманывали.

**Обман 1. Валютный коридор сузят**

Продержался 104 дня.

28 января. Председатель правления Национального банка Беларуси Петр Прокопович заявил, что коридор колебаний курса белорусского рубля к корзине иностранных валют будет сужаться. «Мы с уверенностью можем сказать, что в этой пятилетке курс национальной валюты будет стабильным и предсказуемым… Все могут планировать свою работу и свое поведение не только на этот год, но и на пять лет», - заверил главный банкир.

Пятилетка закончилась досрочно, за три с половиной месяца.

6 мая. Национальный банк принял решение о расширении с 12 мая коридора колебаний курса белорусского рубля к корзине валют с 8 до 12%.

**Обман 2. Никакой разовой девальвации**

Продержался 55 дней

17 марта. Петр Прокопович поклялся перед президентом, что «никакой разовой девальвации в Беларуси не будет. Наш опыт говорит, что резкая девальвация - плохое решение для белорусов». Под разовой девальвацией он имел в виду одномоментное повышение курса иностранной валюты даже на 5%.

Не хотел разовую девальвацию - получил многоразовую…

11 мая. Нацбанк отменил рекомендательные ограничения по установлению банками курсов сделок по покупке-продаже иностранной валюты с населением. В результате курс продажи доллара США в обменных пунктах вырос на 29 процентов - до 4000 рублей. С 16 мая курс доллара повысился еще на 12,5 процента - до 4500 рублей.

**Обман 3. Никаких ограничений на покупку валюты**

Продержался 53 дня.

28 января. Петр Прокопович убеждал, что Нацбанк не будет вводить какие-бы то ни было ограничения на покупку населением валюты. «Если сегодня в пределах страны все можно купить за белорусские рубли, то зачем идти и напрягать всю страну из-за того, что кому-то хочется сказать, что он не верит Национальному банку, что у нас не будет стабильного курса?», - завернул председатель НБРБ.

Население так напрягло страну, что финансовые власти на него обиделись.

22 марта. Национальный банк Беларуси прекратил продажу валюты коммерческим банкам с целью реализации ее населению через пункты обмена валют.

**Обман 4. Оснований для пересмотра прогноза по инфляции нет**

Продержался 26 дней.

31 марта. Вице-премьер Сергей Румас заявил: «Сегодня оснований для пересмотра прогноза по годовой инфляции нет, и правительство будет делать все возможное, чтобы вписаться в утвержденные параметры».

Но правительство достаточно быстро решило не делать все возможное.

26 апреля. Министр экономики Николай Снопков сообщил, что возглавляемое им министерство уточняет годовой прогноз по инфляции: «На данный момент прогноз рассчитывается. В основе расчета лежат два фактора: каким Нацбанк определит равновесный курс и насколько снижение бюджетных расходов позволит выполнить параметры ВВП». К тому моменту прирост потребительских цен составил 8,8% при годовом прогнозе 7,5-8,5%.

**Обман 5. Ставка рефинансирования не превысит 10 %**

Продержался 23 дня.

17 февраля. «Ставка рефинансирования сохранится в запланированных рамках 8-10%, нет смысла трогать ставку рефинансирования и изменять запланированные параметры», уверял заместитель председателя Нацбанка Тарас Надольный.

Смысл появился неожиданно для финансовых властей и, скорее всего, независимо от них.

11 марта. Правление Нацбанка приняло решение о повышении с 16 марта ставки рефинансирования на 1,5 процентного пункта - до 12% годовых. А потом еще и еще. С 18 мая она составляет 14% годовых.

**Обман 6. Ничего не будут делать целый месяц**

Продержался 20 дней

31 марта. Национальный банк объявил о введении моратория на принятие решений в области курсовой валютной и денежно-кредитной политики. Мораторий вводился на месяц, за этот срок власти надеялись получить кредит от России.

Ну, не смогли они сидеть сложа руки дольше трех недель, пока страна стоит в очередях в обменники…

19 апреля. Принято решение о снятии ограничений по формированию курса белорусского рубля при совершении сделок купли-продажи иностранной валюты между банками и субъектами хозяйствования. С тех пор что ни день. Курс доллара начал ставить все новые рекорды на внебиржевом рынке и в итоге вырос там до 8500-9000 белорусских рублей.

**Обман 7. Население доверяет банкам**

Продержался 19 дней

12 марта. Население Беларуси доверяет свои сбережения банкам и увеличивает свои вклады в депозиты, сообщил начальник управления кредитно-депозитного мониторинга главного управления регулирования банковских операций Национального банка Алексей Назаров.

Правда, тут непонятно, кто кого обманывал: банкиры сами себя, или все же это они повелись на сказки населения…

31 марта. За март вклады граждан в национальной валюте снизились на 1,18 триллиона рублей, в иностранных валютах - на 40,4 миллиона долларов США. При этом Нацбанк продолжал пытаться делать хорошую мину: «В соответствии с белорусским законодательством в нашей стране гарантируется полная сохранность сбережения населения во всех банках».

**Вне конкурса. Неделя, растянувшаяся на месяц**

16 апреля. Президент Александр Лукашенко заявил: «Сегодня - завтра - послезавтра мы выровняем ситуацию по валюте. Но вы на меня не обижайтесь. Курс - это дело нескольких дней, надо, может быть, неделя».

Выровнять курс оказалось даже сложнее, чем мешки ворочать.

19 апреля. Сняты ограничения по формированию курса белорусского рубля при совершении сделок купли-продажи иностранной валюты между банками и субъектами хозяйствования. «Ситуация по валюте» не выровнена ни за последовавшую неделю, ни до сих пор. Сохраняется множественность курсов, разница между курсом доллара, устанавливаемым Нацбанком, и складывающимся на межбанковском рынке достигает трех раз, валюта в обменниках так и не появилась.

По-моему, все предельно ясно. Или все эти начальники сознательно нас обманывали, а значит, должны подать в отставку. Или же все их противоречивые заявления и действия - результат некомпетентности, а значит, они должны подать в отставку.

**Вместо послесловия. Новые сказки от главных**

